# Падарунак да Дня ведаў

Радасная вестка імгненна пранеслася сярод студэнтаў і выкладчыкаў. Адкрыццё першага верасня сучаснай камп'ютэрызаванай чытальнай залы стала для іх найкаштоўнейшым і, шчыра кажучы, доўгачаканым падарункам.

У Дзень ведаў на святочную прэзентацыю чытальнай залы прыйшлі яе будучыя наведвальнікі і шматлікія госці. На ўрачыстай цырымоніі выступілі: рэктар БДПУ прафесар П.Д. Кухарчык, прафесар кафедры педагогікі ВШ і сучасных выхаваўчых тэхналогій Л.Н. Ціханаў, загадчык кафедры педагогікі, прафесар І.І. Цыркун, старшыня Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі П.М. Лапо, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь Р.С. Матульскі, дырэктар бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры Г.С. Дашкевіч, студэнты Алена Алхіменкава і Іван Сякацкі.

Засталіся ў мінулым праблемы і арганізацыйныя клопаты. Нялёгка абсталяваць, а затым перанесці цэлую чытальную залу з аднаго корпуса ў другі. Але адміністрацыя універсітэта, будаўнікі і супрацоўнікі бібліятэкі пераадольвалі ўсе гэтыя цяжкасці з вялікай ахвотай. Усе папрацавалі на славу. Сёння работнікі чытальнай залы могуць пахваліцца тэхнічным забеспячэннем, цудоўным інтэр'ерам, стыльнай мэбляй, пад'ёмнікамі, якія шпарка перанясуць неабходную літаратуру з кнігасховішча ў чытальную залу.

Пра перспектывы развіцця бібліятэкі нашага універсітэта, новае ў абслугоўванні чытачоў раскажа ў наступным нумары газеты яе дырэктар Надзея Паўлаўна Сяткоўская.

Наш кар.





